*Д. П. Сергейчук,*
*магістрант кафедры педагогікі*
*і сацыякультурнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# ПЕДАГАГІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ НАРОДНАЙ ГУЛЬНІ

Педагагічная навука заўсёды вядзе пошук эфектыўных сродкаў выхавання падрастаючага пакалення. Гэта звязана з няспыннымі працэсамі паглыбленага набыцця ведаў і з пастаянным павелічэннем шкалы стандарту грамадскай адукацыі.

Развіццё сучаснага грамадства настойліва патрабуе адмысловай увагі да праблем навучання і выхавання дзяцей, пошуку прынцыпова новых метадаў і падыходаў у сістэме выхавання. Сёння, у век паспяховых інфармацыйных працэсаў, час дыктуе свае ўмовы суадносін чалавека з грамадствам. Зараз лёгка можна набыць інфармацыю па любой цікавай тэме, без цяжкасцей звязацца і паразмаўляць у глабальнай сетцы з любым чалавекам, дзе б ён ні знаходзіўся, – вельмі зручна, лёгка і аптымальна для эканоміі часу і сродкаў. Але ёсць і другі бок гэтага станоўчага працэсу. Практыка паказвае, што чалавек, па-першае, выхоўвае ў сабе ляноту (навошта ісці на сустрэчу, калі можна патэлефанаваць і адправіць пэўнае паведамленне па Інтэрнэце); па-другое, становіцца аморфным і пасіўным удзельнікам рэальнага грамадскага жыцця; па-трэцяе, назіраюцца праявы негатыўнага ўздзеяння камп’ютарных гульняў на псіхалагічнае здароў’е чалавека.

Зараз, па сутнасці, большасць дзяцей ведаюць шмат сучасна новых тэхналогій віртуальных зносін. Па прычыне гэтага, на жаль, страчваецца пэўная ступень жыццёва значнага развіваючага ланцужка, які сацыялізуе дзяцей, адаптуе іх да агульначалавечых нормаў грамадскіх узаемаадносін.

Сёння, як ніколі, існуе патрэбнасць выхоўваць у дзяцей эстэтычны густ, гуманасць, прывіваць духоўна-цэнасны арыенцір, які будзе стандартам чалавечнасці [7]. Навукоўцы і жыццёвы вопыт сведчаць аб неабходнасці вяртаць апрабаваныя гісторыяй віды праяўлення чалавечай актыўнасці, і ў прыватнасці статус народнай гульні як адной з асноўных у працэсе выхавання дзяцей [2]. На педагагічныя магчымасці народнай гульні ў свае часы звярталі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўвагу вядомыя навукоўцы, педагогі і псіхолагі, такія як А. Г. Кіркор, С. Цярохін, П. В. Шэйн, Я. Р. Вількін, Е. Р. Раманаў, М. Я. Нікіфароўскі і інш.

У канцы XX ст. навукоўцамі была зроблена спроба больш пашыранага вывучэння праблемнага поля выхавання праз гульню. У працах спецыялістаў па народнай гульнёвай творчасці, такіх як А. Ю. Лозка, В. К. Бандарчык, К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, Л. І. Казлоўская, пададзена класіфікацыя па функцыянальна-тэматычным і каляндарным прынцыпах:

1) каляндарныя і сямейна-абрадавыя гульні (са святочна-абрадавай атрыбутыкай і без яе);

2) гульні, не звязаныя з народным календаром і абрадамі (ці згубілі сувязь).

Каляндарныя і сямейна-абрадавыя гульні з'яўляюцца найбольш кансерватыўным і архаічным пластом народнай спадчыны, у якім адметна захаваліся адбіткі міфалагічных уяўленняў чалавека, язычніцкіх культаў старажытнасці. Гульні другой групы пад уплывам часу змянілі сваю функцыянальную накіраванасць. У іх пераважна дамінуе эстэтычны бок над магічным. У выніку страчвання каляндарна-абрадавай сэнсавай прыналежнасці некаторыя абрадавыя гульні блукаюць паасобку ў скарбніцы народнай культуры [3].

Педагагічныя магчымасці гульні разглядалі ў розныя часы вядомыя навукоўцы П. П. Блонскі, Н. К. Крупская, А. У. Сухамлінскі, Ю. П. Лазаранка, А. В. Мудрык, Г. І. Камаева, В. М. Грыгор'еў, Э. В. Панічава, Л. І. Казлоўская. Па словам Л. С. Выгоцкага: «У гульні магчымы вышэйшыя духоўна-маральныя дасягненні чалавека, якія ў далейшым становяцца яго сярэднім стандартным узроўнем, яго звычайнай мараллю». Гульня пранікае і суправаджае ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека. Яна ўзбуджае ўяўленне, актывізуе фантазію, мабілізуе да набыцця новых ведаў [4]. Народная гульня вяртае чалавека да сваіх каранёў, свайго роду, нацыянальнага асяроддзя, у якім ён не пачувае сябе адзінокім.

Такая мнагаграннасць (поліфункцыянальнасць) гульні, яе значэнне ў жыцці людзей пацвярджае і ўласны педагагічны вопыт. У 2005 г. падчас працы кіраўніком тэатральнага гуртка і рэжысёрам ў невялікім мястэчку Парэчча Гродзенскага раёна, я заўважыў незвычаўную цікавасць і актыўнасць насельніцтва да ўдзелу ў культурным жыцці мястэчка. Удзел у масавых святах, у гульнёвых праграмах і спартыўных выпрабаваннях адзначаўся павышэннем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазітыўнага настрою і святочнай атмасферы. Дзеці актыўна ўключаліся ў працэс народнай гульнёвай дзеі, праяўлялі вялікую цікавасць да народнай беларускай культуры. У віктарынах і загадках, праз абрадавыя тэатралізаваныя гульні ці дзеі з пераапрананнем, пераўвасабленнем яны адкрывалі для сябе новыя веды аб жыцці сваіх продкаў. Вельмі радасна было назіраць за бліскучымі ад задавальнення вачыма дзяцей.

Сёння народныя гульні ў кантэксце свят паступова разбураюць мяжу падзелу на ўдзельнікаў і гледачоў. Гульня ўвогуле займае важнае месца ў жыцці кожнага дзіцяці, тое ж самае, што ў дарослага яго прафесійная дзейнасць. Такую думку ўжо даўно выказаў выдатны педагог А. С. Макаранка [4]. Ён сцвярджаў, што якім праявіцца дзіця ў працэсе гульнёвай дзейнасці, такім яно будзе, па сутнасці, у далейшым жыцці і прафесіі. Па меркаванні Л. С. Выгоцкага, падчас гульні чалавек падымаецца на галаву вышэй за самога сябе, робячы скачок над сваімі паўсядзённымі паводзінамі [гл.: 5].

Адна з асноўных прыкмет любой гульні – гэта яе зместавыя ўмовы, якія ствараюць умоўную сітуацыю для дзеяння. Гульнёвыя правілы з'яўляюцца, па сутнасці, умовамі ўнутранага самавызначэння і самаабмежавання чалавека, адаптацыі да соцыуму, фарміравання камунікатыўнасці і пачуцця значнасці свайго існавання ў калектыве.

Актыўнасць дзяцей у народных гульнях падахвочваецца дзіцячым паразуменнем: «Увесь свет круціцца вакол мяне». Гульня – не толькі стварэнне атмасферы свята, але і стымул для фізічна-творчага развіцця дзяцей, іх здольнасцей. Такія народныя гульні, як «Воранаўскі чыгун», «Брама, або Лавушка», «Яшчар», да прыкладу, накіраваны на набыццё навыкаў арыентацыі дзяцей на мясцовасці. У працэсе такіх гульняў удзельнік праяўляе актыўнасць, волю да перамогі, смеласць і знаходлівасць, выхоўвае ў сабе ўласнае цярпенне і паважлівасць да іншых удзельнікаў гульні. Тэатралізаваная гульня дае магчымасць выявіць здольнасці гульцоў у розных іпастасях. Выконваючы пэўную ролю, удзельнік гульні стараецца пераўтварыцца ў вобраз. Тым самым ён пашырае прастору для самарэалізацыі, свайго ўнутранага бачання рэчаіснасці. Цікава, што гульні з пераапрананнямі для дзяцей найбольш прывабныя, таму што само дзеянне пераапранання, складання вобразу пры дапамозе пэўнага рэквізіту, узмацняе фантазійныя працэсы гульцоў.

Народныя гульні сямейна-родавай абраднасці спрадвеку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстроўвалі комплекс імітацыйных працоўных дзей цягам земляробчага працоўнага цыкла. Яны былі своеасаблівай праверкай гатоўнасці моладзі да адказнай жыццёвай справы (гульня на свята Юр'е «Пастушок», на Масленку «Жарабец, ці Павадыр», на Купалле «Выпрабаванне праз раку», «Скокі праз вогнішча» і інш.).

Значная частка народнага гульнёвага фонду беларусаў прысвечана гендарнаму выхаванню. Ролевыя дзіцячыя гульні ў бацькоў, «Дочкі-мацяры», «Хатка», «Лялькі», «Гаспадыня», «Бабіна страўня» накіраваны на фарміраванне ўменняў па вядзенні гаспадаркі і сямейных спраў. Яны спрыяюць абуджэнню пачуццяў мацярынства, пяшчоты, вучаць сямейным клопатам. У адрозненне ад дзявочых гульняў гульні для хлопчыкаў скіраваны на развіццё такіх якасцей, як працавітасць, мужнасць, вынослівасць, цярпенне, адказнасць за свой род. Народныя гульні для хлопчыкаў прысвечаны фарміраванню якасцей сапраўднага гаспадара. У разуменні нашых продкаў, сапраўдны мужчына павінен добра весці гаспадарку, быць фізічна моцным і вынослівым, спрытным, кемлівым, разважлівым, памяркоўным. Такія гульні, як «Конікі», «Пастушок», «Пеўні», «Схованкі», «Гусі», разам з фізічным выхаваннем перадаюць і пэўныя гаспадарчыя звесткі.

Мы разглядзелі толькі абрысы педагагічных магчымасцей народных гульняў. На сучасным этапе выкарыстанне народнай гульні ў сістэме сацыякультурнай дзейнасці мае шмат праблемных аспектаў, і найперш на шляху пошуку найбольш эфектыўных і аптымальных метадаў і інструментаў рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу народных гульняў. Іх вырашэнне з'яўляецца актуальна важнай і сацыяльна значнай задачай для грамадства, якая патрабуе дасканалага вывучэння і метадычнай распрацаванасці.

1. *Генкін, Д. М.* Массовые праздники / Д. М. Генкин. – М.: Просвещение, 1975.

2. *Гуд, П. А.* Курс лекцый па спецыяльнасці «Гісторыя свят»: распрацоўка выкладчыкаў кафедры рэжысуры абрадаў і свят УА «БДУКМ» / П. А. Гуд [і інш.]. –2003.

3. *Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – 2-е выд., дап. – Мінск: Экаперспектыва, 1997.

4. *Матыцына, И. Г.* «Природа, сущность, история игры» / И. Г. Матыцына // Праблема выхавання. – 2006. – № 1.

5. *Современный* словарь по педагогике / сост. Е. С. Рапацевич. –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Минск: Соврем. слово, 2001.
6. *Шубина, И. Б.* Организация досуга и шоу-программ. Творческая лаборатория специалиста / И. Б. Шубина. – 2-е изд. – Ростов н/Д: Феникс, 2004. – (Хит сезона).
7. *Щукина, Г. И.* Активация познавательной деятельности учащихся в учебном процессе / Г. И. Щукина. – М., 1979.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ